■ Практычнае радзімазнаўства

# Музей як прысутнасць інтэлігентнасці

Ніколі не забуду, як у адным з лістоў да мяне рысы інтэлігентнасці вызначаў настаўнік Пухавіцкай сярэдняй школы Леў Іванавіч Пілатовіч. Маючы за плячыма філалагічную адукацыю, ён падкрэсліваў, што справа зусім не ў тым, каб мець значок і дыплом ВНУ. Інтэлігентнасць — гэта не толькі паводзіны. А хутчэй за ўсё — у сапраўдным інтэлігентнасці закладзены стаўленне да жыцця ўвогуле, разуменне свайго месца ў грамадстве, характар зносін з людзьмі, што знаходзяцца вакол цябе, імкненне перарабіць прастору, спрыяць нармальнай атмасферы ў сацыяльных зносінах. Так, Леў Іванавіч выкладаў усё гэта іншымі словамі, меў у тым нашым ліставанні канкрэтныя прыклады. І ўсё ж мелася на ўвазе інтэлігентнасць...

Успомнілася пра гэта ў дарозе, калі па шляху ў Мінск гутарылі з Аляксандрам Аляксандравічам Прановічам. Ці ў выхадны, ці ў будзённы дзень бываючы на Пухавіччыне, у Мар'інай Горцы, стараюся зазірнуць у музей. Ведаю, што калі б ні пазваніў Прановічу, то ён абавязкова будзе ці на месцы ў карцінный галерэі альбо планы свае выбудзе так, каб абавязкова сустрэцца. Яму цікава размовы, сустрэчы, яму цікава праверыць на людзях свае думкі, меркаванні, планы. Чалавек, якому ўжо споўнілася болей за 70 гадоў, па-ранейшаму актыўны, развароткі, чуйны да ўсяго, што дзеецца навокал. Яму не патрэбны час на адпачынак. Раённы краязнаўчы музей, калектывам якога ён кіруе, — не частка, а ўсё яго жыццё.

Мне здаецца, што і музей у тым выглядзе, у якім яго ведаюць мар'інагорцы, пухавічане, — з цэнтральнай сядзібай у Блоні, у маёнтку Бонч-Асмалоўскіх, карцінный галерэяй, мемарыяльным пакоем Алеся Бачылы, залай Якуба Коласа, філіяламі ў СШ №3 і іншымі сваімі адрасамі, — ёсць яго, Аляксандра Прановіча, атаясамленне. Так, былі пачаткі, вытокі. Былі вядомыя на Пухавіччыне і за яе межамі краязнаўцы. Кожны з іх шмат што зрабіў, кожны пэўную сцежку праклаў... Як не назваць Сяргея Іванавіча Сіпача з яго гарэлецкай «партызанкай»! Як не назваць Віктара Рыгоравіча Арлова, які па крупінках збіраў розныя памяткі ў школьных музеях У. І. Леніна і «Героі і подзвігі», як не назваць тых, хто сваімі публікацыямі пашырыў веданне пра Пухавіччыну ў самыя гістарычныя часіны — Анатоля Паўлавіча Ярохіна, Браніслава Аляксандравіча Зубкоўскага, Аляксандра Васілевіча Пікуліка... І, вядома ж, нельга не ўспомніць Васіля Мікітавіча Свістуна — гэта ж ён пачынаў стварыць раённы музей у Дукоры...



Фота Кастуся ДРОБАВА.

А зараз па дарозе ў Мінск мы гутарым з Прановічам пра клопаты на блізкую будучыню. Крыху — і пра тое, што няпроста музею працаваць як самастойнай гаспадарчай адзінцы.

— Ды што паробіш, — падсумоўвае частку размовы Аляксандр Аляксандравіч, — мы ж такая ж установа, як і іншыя, і нам таксама трэба грошы зарабляць. І на экскурсіях, і на іншых паслугах. Вось зараз на адзін дзень музей аддадзім у арэнду дзеля здымкаў кароткаметражнага фільма з цікавым прыгодніцкім, гістарычным сюжэтам... Тым самым і сябе лішні раз прарэкламуем.

Нядаўна ў карцінный галерэі раённага музея адкрылася мастацкая выстаўка Хведара Ладуцькі. Зямляк-пухавічанін, ён не так даўно адкрыў для сябе музей і галерэю ў Мар'інай Горцы. Дзякуючы найперш свайму сябру — жывапісцу і мастацтвазнаўцу Яўгену Шунейку. Той якраз многіх людзей прывёў у Мар'іну Горку. І з асаблівай асалодай пачаў нават пухавіцкія краявіды маляваць, пухавічан на партрэты заносіць... Пасябраваўшы з Прановічам і з Мар'інай Горкай, Яўген Шунейка і сваёй вучаніцы Дар'і Раманенцы ў час вучобы ў магістратуры даў заданне выканаць даследаванне па музеефікацыі мастацкай прасторы Пухавіччыны. Дакладней кажучы — даў заданне апісаць як галерэю, так і ўсе памкненні дырэктара музея Аляксандра Прановіча па збіранні мастацкіх памятак Пухавіччыны, па ўшанаванні жыцця і творчасці розных мастакоў з пухавіцкай старонкі. А мастакоў адсюль, з Пухавіччыны, выйшла ў свет нямала: і Генрых Вейсенгоф — сярод іх. І Віталь Цвірка меў тут лецішча. І скульптар Аляксандр Фінскі шторазу на выхадныя дні сюды спяшаецца... Атрымалася ў выніку, лічы, манаграфія. І абаронена гэтая праца проста бліскуча.

А Прановіч зусім не сядзіць на месцы...

— Наспеў час зрабіць, арганізаваць яшчэ адзін музейны філіял, — гаворыць ён у дарозе. — Ужо болей за 15 гадоў я дапамагаю народнаму артысту СССР кампазітару Ігару Міхайлавічу Лучанку ўпарадкаваць яго бацькоўскую сядзібу ў Мар'інай Горцы. Тут некалі жылі яго бацькі. Тым самым і рэчы кампазітара, яго бацькоў зберагаюцца. А бацька, між іншым, пачынаў свае жыццёвыя дарогі як музыкант у вандроўнай трупе самога Уладзіслава Галубка!.. Ігар Міхайлавіч столькі зрабіў для Пухавіччыны, Мар'інай Горкі!.. І канцэртаў велізарную процьму даў, і ў традыцыйным музычным фестывалі ў Мар'інай Горцы ўдзельнічае... А колькі людзей ён да нас прывозіў — «Песняры» не адзін раз у Мар'інай Горцы выступалі.

Сапраўды — разважаю сам сабе, не перабіваючы Прановіча, — як на мой прыватны погляд, такі філіял — з назвай, напрыклад, «Музей музычнай і тэатральнай гісторыі Пухавіччыны» — мае самае што ні ёсць права на жыццё ў Мар'інай Горцы. Да матэрыялаў у яго экспазіцыі далучыліся б зборы цікавых дакументаў, кніг, фотаздымкаў і нават партрэтаў, якія расказалі б пра земляком — Іосіфа Жыновіча з яго захапленнем цымбаламі, акцёраў Таццяну Бандарчык (нарадзілася ў Дукоры), Юлію Хіраску (яна нараджэннем з вёскі Омельна, з сям'і праваслаўнага святара, балерына, якая вучылася яшчэ ў студыі другога нашага земляка — Канстанціна Алексютовіча), Івана Шацілы... Пералік можна доўжыць. Музычная, тэатральная памяць пра наш край — гэта яшчэ і зварот да лёсаў прадстаўнікоў рода Ельскіх. Міхал Ельскі — славуты кампазітар дзевятнаццатага стагоддзя. Адным словам, экспанатаў, матэрыялаў для стварэння такога музея-філіяла бракаваць не будзе.

Другі сённяшні клопат пухавіцкага музейшчыка — гэта дастойна адзначыць стагоддзе з дня нараджэння аўтара верша (адпаведна, і слоў песні) «Радзіма мая дарагая» Алеся Мікалаевіча Бачылы (паэт нарадзіўся ў пухавіцкай вёсцы Лешніца). Дата прыпадае на пачатак сакавіка 2018 года. Ужо болей як дзесяцігоддзе (мо нават недзе каля двух дзесяцігоддзяў) у Мар'інай Горцы праводзяцца мерапрыемствы, звязаныя з ушанаваннем імя гэтага творцы. Адна з сельскіх бібліятэк носіць імя Алеся Бачылы. Чаму б не надаць імя паэта і Пухавіцкай раённай бібліятэцы?! У горадзе ёсць вуліца Алеся Бачылы. «Чужое зямлі нам не трэба, / Пачуцці ў нас сёння адны: / Мы хочам, каб мірнае неба / Не знала пажару вайны. / Мы дружбы народам жадаем / І шчырай братэрскай любві. / Радзіма мая дарагая, / Красуйся і ў шчасці жыві!» Гэтыя радкі — са згаданых верша і песні... Алесь Бачыла напісаў словы на ўсе стагоддзі, для ўсіх пакаленняў...

Мемарыялізацыя імёнаў, жыццяў знакамітых землякоў заўсёды была часткай музейнай практыкі Аляксандра Прановіча.

...Дарога ў Мінск паціху завяршаецца. Падсумоўваем і мы сваю з Аляксандрам Аляксандравічам размову. А хацелася б яе доўжыць... Ды кожнага чакаюць свае справы, свае ўласныя клопаты. Хоць і дзень, здавалася б, у нас вольны — выхадны дзень... Я яшчэ нагадваю Аляксандру Прановічу, што не так ужо далёка і да 75-годдзя з часу вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А следам — і да 75-годдзя Вялікай Перамогі. А значыць — трэба ўспомніць і шмат каго з землякоў, хто аддаў свае жыцці за свабоду Айчыны, за тое, каб адолець фашызм... З такіх людзей — і падпалкоўнік Фёдар Смяяновіч. І шкада, што па сённяшні дзень няма ў Мар'інай Горцы вуліцы імя Фёдара Аляксеевіча Смяяновіча. Афіцэр-дэсантнік, ён з'яўляецца адным з першых выпускнікоў Аб'яднанай ваеннай беларускай школы (у 1929 годзе). Ф. Смяяновіч, адзначаны за адзін з подзвігаў ордэнам Чырвонага Сцяга, загінуў недзе на Дняпры ў 1943 годзе. А ў 1941-м паспеў закончыць Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзэ. На Малай Зямлі камандаваў дэсантным палком. Аляксандр Аляксандравіч пагаджаецца: быць у Мар'інай Горцы вуліцы Фёдара Смяяновіча...

— Нядаўна прыязджаў да нас дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктар філалагічных навук Ігар Капылоў, — паспявае яшчэ расказаць пухавіцкі музейшчык. — Збіраемся праводзіць тапанімічную канферэнцыю ці тапанімічныя чытанні...

І я ізноў радуюся новай асветніцкай, краязнаўчай ініцыятыве. І разумею, што музейнае, краязнаўчае святло такіх асоб, як Аляксандр Прановіч, прыўносіць у наша жыццё — ці то ў сталіцы, ці то ў рэгіёне — сапраўдную інтэлігентнасць, сапраўднае святло чалавечнасці. Мусіць, на гэтым і жыццё трымаецца...

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**

■ Асоба ў гісторыі

# ВЯЛІКІ МАТЭМАТЫК З ЯРЭМІЧ

**У 1920-я гады ў Маскве вучылася шмат выхадцаў з Беларусі, якія ехалі ў расійскую сталіцу набываць веды, каб потым аддаць іх на карысць Бацькаўшчыне. У склад беларускага зямляцтва ў Маскве ўваходзіла тады больш за тысячу чалавек, для якіх арганізоўваліся сходы і гурткі, дзе можна было прайсці курс беларусазнаўства, пазнаёміцца з гісторыяй і эканомікай сельскай гаспадаркі Беларусі. Акрамя таго, у вышэйшых навучальных установах наладжваліся вечары для знаёмства з беларускай культурай. У гэты ж час у Маскве дзейнічала беларуская тэатральная студыя, спектаклі якой з задавальненнем наведвалі нашы земляки. Сярод іх і Міхась Лойка — будучы вялікі беларускі эканаміст, географ і матэматык родам з вёскі Ярэмічы Карэліцкага раёна.**



Вялікім поспехам карысталіся ў слухачоў выступленні беларускага хору, арганізаванага ў Маскве Міколам Равенскім. Першае выступленне гэтага хору адбылося ў маі 1924 года ў Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцей Захаду, дзе ў той час працаваў Міхась Лойка. На беларускім вечары, наладжаным Белсектарам для студэнцтва ўніверсітэта і беларускага зямляцтва, наш зямляк глядзеў драму Васіля Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі». Не абмінуў сваёй увагай і выстаўку беларускага друку.

Невыпадкова ў 1924 годзе Міхась Лойка быў абраны правадзейным членам Інстытута беларускай культуры ў Мінску.

У гэты ж час ён пачаў працу над падручнікам «Першыя крокі ў матэматыцы». Кніга выйшла ў 1924 годзе на беларускай мове, а ў наступным годзе была перавыдадзена.

У 1926 годзе наш зямляк вярнуўся ў Беларусь, дзе пачаў працаваць выкладчыкам эканамічнай геаграфіі ў Камуністычным універсітэце Беларусі імя Леніна. У 1932 годзе гэта навучальная ўстанова была рэарганізавана ў Вышэйшую сельскагаспадарчую школу Беларусі. Тады ж Міхась Фёдаравіч дапрацаваў той падручнік матэматыкі, які выйшаў раней, напісаў яго другую частку і выдаў у Мінску з дадаткамі і папраўкамі. Адначасова ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі ўбачыў свет яго новы падручнік «Матэматыка (працоўная кніга)». У прадмове да гэтага падручніка аўтар паведамляў, што ён «напісаны для першага году навучання ў беларускай школе». Матэрыял у падручніку размеркаваны па тэмах, блізкіх і зразумелых дзецям. Каб зацікавіць школьнікаў прадметам, аўтар выкарыстоўваў матэматычныя гульні, задачы-жарты і загадкі. У прадмове ён звяртаецца да настаўнікаў з просьбай дасылаць яму карысныя заўвагі, якія дазволяць зрабіць падручнік больш дасканалым.

У пачатку 1930-х гадоў вучоны працягваў плённа працаваць, ствараў новыя кнігі. Так, у 1930 годзе ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве выходзяць яго падручнікі «Беларуская ССР у задачах. Рабочая кніга па матэматыцы» і «Наш калгас. Рабочая кніга па матэматыцы», у 1931 годзе — «Рабочая кніга па матэматыцы», у 1932 годзе — «Матэматычны задачнік».

У 1931 годзе ў Беларускай АН быў арганізаваны Інстытут эканомікі. Загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі ў гэтым інстытуце быў прызначаны Міхась Лойка. Неўзабаве ён стаў вучоным сакратаром, а затым намеснікам дырэктара Інстытута эканомікі. Пазней узначаліў кафедру эканамічнай геаграфіі Мінскага педінстытута. У 1935 годзе стаў дэканам геаграфічнага факультэта гэтай навучальнай установы. У 1930-я гады ўбачылі свет яго навуковыя працы, падручнік па геаграфіі «Геаграфія (фізічная і палітычная карта свету)», створаны вучоным разам з Т. Езавітам і А. Сакольчыкам.

У пратаколах пасяджэнняў Прэзідыума АН БССР захаваліся звесткі аб тым, што ў 1934 годзе Цэнтральнае бюро краязнаўства Масквы звярталася туды з просьбаю выслаць фізічную карту БССР пад рэдакцыяй Міхася Лойкі.

Вучоны ўваходзіў у склад рэдакцыйнай калегіі па выданні «Вялікага атласа БССР», адкуль быў выведзены пастанаўленнем Прэзідыума АН БССР у красавіку 1936 года. І невыпадкова: над галавой яго ўжо згусціліся хмары. У 1937 годзе нашага земляка рэпрэсавалі. Так у 45-гадовым узросце загінуў адзін з таленавітых беларускіх вучоных, які стаяў каля вытокаў беларускай навукі. І толькі праз 20 гадоў Міхась Лойка быў пасмяротна рэабілітаваны. У Год навукі хочацца яшчэ раз нагадаць яго імя.

**Святлана КОШУР**